*Агата Мацко*

# ФЕНОМЕН СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ: ДЭФІНІЦЫЯ ПАНЯЦЦЯ

Кожны з падвідаў культуры любога народа (напрыклад, прававан, тэатральная, музычная культура, культура этыкету і г.д.) дэманструе яго этнічныя, сацыяльныя, мастацкія і іншыя адметнасці. Крыху асобна ад гэтых відаў стаіць святочная культура. З антычных часоў гэтаму феномену надавалі вялікае значэнне. Так, у сваіх «Законах» Платон аналізуе, апісвае сутнасць свята і адносіць яго вытокі да сферы дзейнасці алімпійскіх багоў: «...Верно направленные удовольствия и страдания составляют воспитание; однако в жизни людской они во многом ослабляются и извращаются. Боги из сострадания к человеческому роду, рожденному для трудов, установили, взамен передышки от этих трудов... празднества, даровали Муз, Аполлона, их предводителя, и Диониса, как участников этих празднеств, чтобы можно было исправлять недостатки воспитания на празднествах...» [1, с. 38].

Святочная культура – неад'емная частка жыцця ўсіх прадстаўнікоў чалавечай супольнасці (*сялян, гараджан, адміністратараў, студэнтаў*), бо святочны дзень – гэта антытэза працоўнаму. Свята – адна з спецыфічных праяў вольнага часу. Папулярны тлумачальны слоўнік С.І. Ожэгава трактуе гэта як выходны, непрацоўны дзень [2, с. 1200]. Тым не менш, М.М. Бахцін у сваёй працы «Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса» сцвярджае, што свята нельга лічыць простым перадыхам у манатонным чарагаванні працоўных дзён, паколькі ў жыцці існуе не мала вольных ад працы дзён, якія не маюць ніякага дачынення да свят.

У сістэмах аграрных святаў старажытных народаў Еўразіі такія даследчыкі як Джэймс Фрэзер і Вільгельм Мангарт бачылі ўшанаванне багоў паміраючай і ўваскрасаючай расліннасці [3, с. 6]. Сама ідэя няспыннага чаргавання цыклаў звязана з этыкай, паводзіннымі стандартамі грамадства і дала чалавецтву многія вельмі дакладна экалагічна збалансаваныя і высокамаральныя канцэпцыі светапогляду, напрыклад, індуізм і будызм. Сучасная еўрапейская цывілізацыя з павагай і інтарэсам ставіцца да іх каштоўнасцяў і шмат з іх запазычвае і адаптуе для сваіх патрэб.

Вядомы даследчык В.Я. Проп, які прысвяціў адно з сваіх даследаванняў («Русские аграрные праздники») аграрным святам расіян і іншых славянскіх народаў, лічыў іх светапоглядаай асновай культ памерлых продкаў [3, с. 7]. Некаторыя элементы ўшанавання продкаў і выбітных прадстаўнікоў свайго народа ўвайшлі і ў сучасную святочную культуру. Для прыкладу можна прывесці свята Перамогі, прысвечанае ўшанаванню памяці загінуўшых у ІІ Сусветнай вайне, якое трывала ўвайшло ў святочную культуру постсавецкіх краін.

Каляндарныя, аграрныя, родавыя святы ў свой час заклалі карані, асновыу сучаснай святочнай культуры. Зарыентаваныя на адаптацыю да наваколля чалавека, як біялагічнага віда, яны блізкія да яго прыроды і таму надзвычай устойлівыя. Пазней у сістэму святаў увайшлі гістарычныя, дзяржаўныя, муніцыпальныя складовыя, якія кожны раз уносілі разнастайнасць і варыятыўнасць у святочную культуру розных народаў і, нават, розных рэгіёнаў адной краіны.

Для вызначэння дэфініцыі святочнай культуры варта падкрэсліць, што яна ўключае ў сябе не толькі сістэму святаў (рытуальных фармаўтварэнняў, якія складаюць каляндарна-абрадавы цыкл жыцця народа), але і комплекс правоў і абавязкаў, нормаў паводзін індывіда і яго сацыяльнай групы. Адданасць асобы і супольнасці такому комплексу вядзе да правільнага ўспрымання і разумення сімвалічнага тэксту дзеі, што адбываецца. Акрамя таго, да ўздзеяння на светапогляд чалавека, уключанага ў кантэкст свята, і, нават, да фарміравання пэўнага этнічнага, і этнаэкалагічнага светапогляду супольнасці.

Святочная дзея дасягае свайго «функцыянальнага поспеху» (спачатку – ухваленне паганскіх багоў на добры ўраджай, ініцыяцыя моладзі, потым – святкаванне ўгодак з дня народзінаў ці памятнай даты) праз шэраг функцый: ідэалагічную, выхаваўчую, эстэтычную, забаўляльную, рэкрэацыйную, камунікатыўную. Такія якасці, па меркаванні А.В. Луначарскага, аднаго з аўтараў новай эфектыўнай ідэалогіі былога СССР, адносяць яе да «адных з фундаментальных з'яў чалавечай культуры».

Асобна трэба падкрэсліць сутнасць святочнай культуры як сукупнасці яе матэрыяльных атрыбутаў (сутнасных, неад'емна прыналежных да яе прыкмет) з больш шырокімі, нематэрыяльнымі сэнсамі. Напрыклад, валынка з'яўляецца нацыянальным музычным інструментам старажытнай Шатландыі і не адно традыцыйнае свята не пройдзе без яе суправаджэння. Шапкі з мядзвежага футра з'яўляюцца галоўнай часткай параднага касцюма ганаровай варты пры Букінгемскім палацы ў Вялікабрытаніі. Без пасталару, якім грукаюць у дзверы касцёла пры яго кансекрацыі, не здзейсняцца сакральныя дзеянні каталіцкага біскупа ў гэтым рытуале. Такім чынам, святочная культура захоўвае не толькі духоўныя каштоўнасці, але і актыўна спрыяе зберажэнню каранёвых матэрыяльных культурных каштоўнасцяў чалавецтва.

Таксама можна адзначыць, што асоба, якая выконвае пэўныя дзеянні ў свяце ці абрадзе, з'яўляецца такім жа неабходным «атрыбутам свята», толькі мадыфікаваным ў жывога чалавека (паганскага жраца, цырыманімайстра пры каралеўскіх дварах, распарадчыка ў ігрышчах). Тут варта прывесці прыклады з муніцыпальных і дзяржаўных святочных і рытуальных падзей, напрыклад:



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

сімвалічны шлюб венецыянаскага дожа (першай асобы горада) з морам, святочныя інаўгурацыі кіраўнікоў розных краін і г.д. Такія акалічнасці яднаюць святочную культуру з ідэалагічнай сферай жыцця грамадства і сцвярджаюць яе важнае месца ў сістэме сучасных грамадскіх і палітычных інстытутаў.

Як заўважна з выкладзенага вышэй, святочная культура дасягае сваёй дзейснасці праз шэраг функцый: ідэалагічную, выхаваўчую, эстэтычную, забаўляльную, рэкрэацыйную, камунікатыўную. Яна з'яўляецца своеасаблівым «люстэркам» грамадскай свядомасці і, адначасова, сродкам яе рэалізацыі, які па шэрагу накірункаў актыўна ўдзельнічае ў фарміраванні таго, што адлюстроўвае і рэалізуе. У сувязі з гэтым, каранёвы (этнічны, фальклорны) складальнік святочнай культуры, як яе аснова і формаўтвараючы пачатак, абавязкова павінны ахоўвацца і трансліравацца ў часе.

Спіс літаратуры:

1. Платон. Сочинения : в 3 т. / Платон. – М. : Наука, 1972. – Т. 3, ч. 2. – 465 с.
2. Ожегов, С.И. Словарь русского языка / С.И. Ожегов. – М. : Оникс 21 век, 2004. – 1460 с.
3. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: Летне-осенние праздники. – М.: Наука, 1978. – 295 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ